#KeepItOn
Fighting Internet Shutdowns around the World

5 жніўня 2020 года

**#KeepItOn: Калектыўны ліст аб забеспячэнні свабоднага і бяспечнага доступа ў інтэрнэт у перыяд прэзідэнтскай кампаніі ў Беларусі**

**Тэма: Доступ у інтэрнэт забяспечыць больш шырокі удзел у прэзідэнцкіх выбарах у Беларусі і іх празрыстасць**

Аляксандру Лукашэнку,
Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь
праспект Пераможцаў, 12
г. Мінск, Беларусь

Копія: Міністру сувязі і інфарматызацыі Канстанціну Шульгану, Намесніку Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзіі Ярмошынай

Мы, арганізацыі, якія ўдзельнічаюць у кампаніі #KeepItOn, міжнародным руху, які аб'ядноўвае больш за 220 арганізацый з 99 краін, і іншыя няўрадавыя арганізацыі, выступаем за спыненне адключэнняў доступа да інтэрнэту па ўсім свеце. Мы звяртаемся да Вас з настойлівым заклікам забяспечыць стабільную працу і дасяжнасць інтэрнэт-платформ і сацыяльных сетак падчас і пасля прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі, прызначаных на 9 жніўня 2020 года. **Мы заклікаем Вас, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, забяспечыць адкрытасць, бяспеку і даступнасць інтэрнэту і іншых каналаў сувязі падчас усяго перыяду правядзення выбараў у Рэспубліцы Беларусь.**

Інтэрнэт грае вырашальную ролю у прадастаўленні людзям магчымасці **атрымліваць інфармацыю** і быць у курсе таго, як адбываюцца выбары. Акрамя таго, доступ у інтэрнэт і сацыяльныя сеткі дазваляюць людзям **быць актыўнымі ў працэсе галасавання, прымаць удзел у грамадскіх абмеркаваннях**, а таксама забяспечвае **справаздачнасць абраных лідараў перад грамадзянамі**, што з'яўляецца важнымі прынцыпамі любога дэмакратычнага грамадства.

Мы пішам, каб выказаць сур'ёзную занепакоенасць у сувязі з інфармацыяй, якая даходзіць да нас пра меркаванае глушэнне 19 ліпеня 2020 года мабільнага інтэрнэту ў Беларусі з мэтай разгону пратэстуючых, якія пікетавалі побач з праспектам Незалежнасці у Мінску. Акрамя таго, мы атрымалі паведамленні аб адвольных арыштах і затрыманнях журналістаў, якія працуюць у СМІ, якія асвятляюць пратэсты.

Акрамя гэтых нядаўніх паведамленняў, мы таксама атрымалі паведамленні пра павялічэнне колькасці выпадкаў парушэння правоў чалавека і пераследванняў

журналістаў, праваабаронцаў і апазіцыйных палітыкаў перад выбарамі, што прывяло да атмасферы страха і панікі.

Мы выказваем сур'ёзную занепакоенасць адсутнасцю у Беларусі свабоднай і адкрытай прасторы для выказвання свайго меркавання ў час перад выбарамі, і мы заклікаем Вас і Ваш урад прыняць хуткія захады для спынення наступных парушэнняў правоў чалавека ў Беларусі. Адстойванне фундаментальных правоў уключае ў сябе адстойванне правоў на свабоду выказвання меркавання, свабоду прэсы, свабоду распаўсюду і доступу да інфармацыі, а захоўванне свабоды сходаў неабходна для любога дэмакратычнага грамадства. Гэтыя правы павінны быць абароненыя заўсёды.

З'яўляючыся рухам, які верыць у моц інтэрнэту як фактара, што спрыяе ажыццяўленню усіх іншых правоў чалавека, мы ўпэўненыя, што доступ да інтэрнэту і да сацыяльных сетак падчас выбараў у Беларусі дапаможа забяспечыць празрыстыя і справядлівыя вынікі надыходзячых прэзідэнцкіх выбараў, шляхам забеспячэння актыўнага ўдзела грамадзян.

Мы шчыра вітаем Вашу заяву ў красавіку 2019 года, аб якой паведаміў навінны рэсурс БелТА, дзе Вы падкрэслілі, што інтэрнэт з'яўляецца асноўнай крыніцай для большасці людзей, і асудзілі выкарыстанне адключэнняў інтэрнэту як спосабу прымусіць людзей замаўчаць. Вы таксама заклікалі дзяржаўных службоўцаў больш працаваць з інтэрнэт-супольнасцю для паляпшэння інтэрнэт-ландшафта ў Беларусі.

Мы падзяляем Вашае меркаванне пра тое, што адключэнне інтэрнэту наносіць шкоду розным аспектам жыцця людзей, і мы заклікаем Вас звярнуць увагу на заўвагі, якія Вы рабілі год таму, асуджаючы адключэнні інтэрнэту і беручы на сябе абавязальніцтва падтрымліваць інтэрнэт цягам усяго выбарчага працэсу ў Беларусі.

**Адключэнне інтэрнэту негатыўна ўплывае на правы чалавека, парушае працу экстраных службаў і наносіць шкоду эканоміцы**

Даследванні паказваюць, што адключэнні інтэрнэту і гвалт ідуць адно за адным[1], [2]. Спыненне працы інтэрнэту падчас смяротнай пандэміі дадасць алею ў агонь. Умешваючыся ў свабодны рух інфармацыі, адключэнні абвастраюць любую існуючую напругу ў грамадстве і павялічваюць верагоднасць пратэстаў, а таксама імавернага гвалту і парушэнняў правоў чалавека, якія здзяйсняюцца як дзяржаўнымі, гэтак і недзяржаўнымі суб'ектамі. Акрамя таго, без доступа да

[1] Отключение интернета - преднамеренное прерывание работы интернета или электронных коммуникаций, делающее их недоступными или фактически непригодными для определенной группы населения или в пределах определенного места, обычно осуществляется для установления контроля над потоками информации. Больше информации: https://accessnow.org/keepiton
[2] Anita R. Gohdes, 'Pulling the Plug: Network Disruptions and Violence in the Syrian Conflict' (Journal of Peace Research: 31 January 2014) http://www.anitagohdes.net/uploads/2/7/2/3/27235401/gohdes_synetworkaug14.pdf

#KeepItOn
Fighting Internet Shutdowns around the World

сродкаў камунікацыі журналісты і іншыя супрацоўнікі СМІ не могуць паведамляць аб працэсе выбараў[3]. Нягледзячы на тое, што ўрад спрабуе апраўдаць збоі ў працы сеткі, насамрэч адключэнне інтэрнэту блакіруе доступ да жыццёва важнай і ратуючай жыццё інфармацыі, да службаў экстраннай дапамогі, павяргаючы ўсё грамадства ў страх і разгубленнасць.

Неабходна таксама адзначыць, што тэхнічныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для блакіроўкі доступа да інфармацыі ў інтэрнэце часта небяспечна падрываюць стабільнасць і ўстойлівасць інтэрнэту. Акрамя таго, збоі ў працы сеткі дэстабілізуюць магчымасць інтэрнэта забяспечваць жыццездольнасць малога бізнэсу і стымуляваць эканамічнае развіццё.

**Адключэнне інтэрнэту супярэчыць нормам нацыянальнага і міжнароднага права**

Адключэнні інтэрнэту парушаюць фундаментальныя правы чалавека, такія як свабода выказвання меркаванняў, доступ да інфармацыі і права на мірныя сходы, якія сярод іншых правоў гарантуюцца на нацыянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўні, як, напрыклад, у Кастытуцыі Рэспублікі Беларусь і ратыфікаванай Вамі Ўсеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека (УДПЧ).

Камітэт ААН па правах чалавека, які валодае правам афіцыйнага тлумачэння Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах (МПГПП), падкрэслівае ў сваіх Заўвагах агульнага парадку №34, што абмежаванні свабоды слова ў інтэрнэце павінны дакладна адпавядаць патрабаванню неабходнасці і суразмернасці з пункту гледжання закона. Адключэнні інтэрнэту ж у сваю чаргу насупраць, непрапарцыйна адбіваюцца на ўсіх карыстальніках і занадта абмяжоўваюць доступ да інфармацыі і экстраным службам у крытычныя моманты. Адключэнні інтэрнэту не з'яўляюцца ні неабходным, ні эфектыўным захадам у дасягненні законнай мэты, бо яны блакіруюць шляхі распаўсюду інфармацыі, спрыяюць хваляванням і беспарадкам, парушаюць грамадскую бяспеку.

У дадзеным звароце мы просім Вас забяспечыць доступ насельніцтва Беларусі да інтэрнэту і іншых лічбавых сродкаў сувязі, каб яны маглі карыстацца гэтымі правамі. З усёй павагай, мы просім Вас выкарыстаць Вашыя паўнамоцтвы і зрабіць ласку:

- Пераканацца, што інтэрнэт, уключаючы сацыяльныя сеткі і іншыя лічбавыя

[3] Jonathan Rozen, 'Journalists under duress: Internet shutdowns in Africa are stifling press freedom' (Africa Portal: 17 August 2017) https://www.africaportal.org/features/journalists-under-duress-internet-shutdowns-africa-are-stifling-press-freedom/

#KeepItOn
Fighting Internet Shutdowns around the World

камунікацыйныя платформы, застаецца адкрытым, даступным і бяспечным па ўсёй Беларусі на працягу ўсіх выбараў;

- Распарадзіцца аб вызваленні ўсіх палітычных зняволеных і актывістаў, якія на дадзены момант знаходзяцца пад вартай у разнастайных праваахоўных органах Беларусі;
- Устрымацца ад далейшых пагрозаў і вэрбальнага гвалту супраць журналістаў і забяспечыць, што ў далейшым да журналістаў не будзе ўжывацца фізічны гвалт з боку праваахоўных органаў, уключна падчас асвятлення дэманстрацый і выбараў; а таксама дазволіць журналістам бяспечна асвятляць афіцыйныя падзеі;
- Працаваць у супрацоўніцтве з рознымі інтэрнэт-правайдэрамі Беларусі, каб усе людзі мелі доступ да якаснага, бяспечнага, бясплатнага і адкрытага інтэрнэту цягам усяго перыяду выбараў і пасля яго;
- Даручыць розным інтэрнэт-правайдэрам, якія дзейнічаюць у краіне, інфармаваць інтэрнэт-карыстальнікаў пра любыя збоі і працаваць кругласуткава, каб выпраўляць любыя выяўленыя збоі, якія могуць паўплываць на якасць паслуг інтэрнэт-правайдэраў;
- Адстойваць асноўныя правы чалавека для ўсяго народу Беларусі цягам усіх выбараў і пасля іх.

Пераканаўча просім даць нам ведаць, калі мы можам аказаць дапамогу па любым з гэтых пытанняў.

З павагай,

Access Now
Advocacy Initiative for Development (AID)
African Freedom of Expression Exchange (AFEX)
Africa freedom of Information Centre (AFIC)
Africa Open Data and Internet Research Foundation (AODIRF)
AfroLeadership
Azerbaijan Internet Watch (AIW)
Centre for Media Studies and Peacebuilding (CEMESP)
Committee to Protect Journalists (CPJ)
DefendDefenders (East Africa and the Horn of Africa)
Free Expression Myanmar (FEM)
Free Press Unlimited (FPU)
Human Constanta (Belarus)
International Press Centre (IPC)
Internet Protection Society (Russia)
Iraqi Network for Social Media (INSM)
L’Association Francophone pour les Droits de l’Homme (AFDH)

#KeepItOn
Fighting Internet Shutdowns around the World

Liberia Information Technology Student Union
Media Foundation for West Africa (MFWA)
Media Institute of Southern Africa-Zimbabwe (MISA-Zimbabwe)
Media Rights Agenda (MRA)
Open Net (Korea)
Open Observatory of Network Interference (OONI)
Paradigm Initiative
PEN America
Reporters Sans Frontières (RSF)
RosKomSvoboda (Russia)
Southeast Asia Freedom of Expression Network (SAFEnet)
Unwanted Witness Uganda
YODET
UBUNTEAM
Software Freedom Law Center, India
Villes et Communes Magazine
Беларускі ПЭН-цэнтр
Беларускі дакументацыйны цэнтр
Прававая ініцыятыва
Таварыства абароны інтэрнэту (Россия)
Республиканская общественная молодежная организация "Гражданский форум"
РосКомСвабода (Россия)
Ініцыятыва Forb